I варыянт

1. Калі была прынята Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь:
а) 15 сакавіка 1991 г.; б) 15 красавіка 1993 г.; в) 15 сакавіка 1994 г.?

2. Вызначце, якая з характарыстык дзяржавы не падыходзіць для сучаснай Рэспублікі Беларусь:
а) дэмакратычная; б) незалежная; в) федэратыўная; г) сацыяльная?

3. Палітычная арганізацыя, якая выражае інтарэсы той ці іншай групы людзей і прымае ўдзел у палітычным жыцці грамадства з мэтай атрымання палітычнай улады называецца:
а) палітычная партыя; б) апазіцыя; в) грамадскае аб’яднанне.

4. Заканадаўчым органам Рэспублікі Беларусь з’яўляецца:
а) Савет рэспублікі; б) Нацыянальны сход; в) Палата прадстаўнікоў.

5. Што аб’ядноўвае наступных асоб: К.Хадатовіч, В.Шчэрба, Я.Карольчык, Ю.Несцярэнка.

6. Пазнайце паняцце: Усенароднае галасаванне па найважнейшым пытанням жыццядзейнасці краіны – гэта…

7. Устанавіце адпаведнасць:
а) С.Шушкевіч; б) Ж.Алфёраў; в) І.Чыгрынаў; г) М.Фінберг; д) М.Пташук; е) Г.Вашчанка – 1) народны мастак Беларусі; 2) старшыня Вярхоўнага Савета РБ у 1990 – 1994 гг.; 3) кінарэжысёр, аўтар фільма “У жніўні 44-га...”; 4) вучоны-фізік, лаўрэат Нобелеўскай прэміі; 5) дырыжор, кіраўнік Дзяржаўнага аркестра Беларусі; 6) пісьменнік, аўтар рамана “Вяртанне да віны”.

8. Прачытайце ўважліва прыведзены ўрывак з Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і адкажыце на пытанне, аб якой характарыстыцы нашай дзяржавы ён сведчыць?
“…Тэрыторыя Беларусі адзіная і непадзельная. Тэрыторыя падзяляецца на вобласці, гарады і іншыя адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі. Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел дзяржавы вызначаецца заканадаўствам.”

9. Растаўце ў храналагічнай паслядоўнасці:
а) трэція прэзідэнцкія выбары ў Рэспубліцы Беларусь; б) падпісанне Беларуссю і Расіяй Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы; в) зацвярджэнне назвы “Рэспубліка Беларусь”; г) рэспубліканскі рэферэндум па пытаннях дзяржаўнага статусу беларускай і рускай моў, новай дзяржаўнай сімволікі.

10. Пералічыце прынцыпы знешнепалітычнай дзейнасці Рэспублікі Беларусь:
а) роўнасць усіх дзяржаў; б) непрымяненне сілы ці пагрозы сілай; в) непарушнасць дзяржаўных межаў; г) нарошчванне ваеннага патэнцыялу; д) распрацоўка навейшых відаў узбраення; е) мірнае ўрэгуляванне спрэчак паміж дзяржавамі; ж) неўмяшальніцтва ва ўнутраныя справы іншых краін.

II варыянт

1. Калі адбыліся першыя прэзідэнцкія выбары ў Рэспубліцы Беларусь:
а) ліпень 1992 г.; б) жнівень 1993 г.; в) ліпень 1994 г.?

2. Вызначце, якая з характарыстык не падыходзіць для сучаснай Рэспублікі Беларусь:
а) прававая; б) сацыяльная; в) унітарная; г) таталітарная?

3. Сукупнаць ідэй і ідэалаў, якія адлюстроўваюць нацыянальна-гістарычныя традыцыі і каштоўнасці беларускага народа, адпавядаюць мэтам і асаблівасцям развіцця беларускага грамадства – гэта:
а) ідэалогія беларускай дзяржавы; б) канстытуцыя; в) культура.

4. Выканаўчую ўладу ў Рэспубліцы Беларусь ажыццяўляе:
а) Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь; б) Савет міністраў; в) Савет рэспублікі.

5. Што аб’ядноўвае наступных асоб: П.Марыяў, М.Высоцкі, М.Карчміт, А.Дубко?

6. Пазнайце паняцце: Працэс і вынік узаемасувязі, узаемадзеяння, збліжэння і аб’яднання ў адзінае цэлае якіх-небудзь частак, элементаў, у прыватнасці краін і іх эканомік, грамадскіх і палітычных структур, партый і арганізацый – гэта…

7. Устанавіце адпаведнасць:
а) У.Карват; б) Н.Гілевіч; в) М.Чаргінец; г) В.Елізар’еў; д) А.Дудараў; е) А.Кішчанка – 1) пісьменнік, аўтар рамана “Вам – заданне”; 2) мастак, аўтар габеленаў “Чарнобыль”, “Габелена Стагоддзя”; 3) ваенны лётчык, першы Герой Беларусі; 4) вядомы паэт, аўтар зборніка “Незалежнасць”; 5) славуты беларускі балетмайстар; 6) драматург, аўтар п’ес “Чорная панна Нясвіжа”, “Князь Вітаўт”.

8. Прачытайце ўважліва прыведзены ўрывак з Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і адкажыце на пытанне, аб якой характарыстыцы нашай дзяржавы ён сведчыць?
“…Рэспубліка Беларусь валодае вяршэнствам і паўнатой улады на сваёй тэрыторыі, самастойна ажыццяўляе ўнутраную і знешнюю палітыку…”

9. Растаўце ў храналагічнай паслядоўнасці:
а) прыняцце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь; б) прыняцце на рэспубліканскім рэферэндуме папраўак у Канстытуцыю РБ, звязаных з парадкам правядзення выбараў Прэзідэнта РБ; в) спыненне існавання СССР і стварэнне СНД; г) прыняцце Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР.

10. Пералічыце характэрныя рысы беларускай мадэлі сацыяльна-эканамічнага развіцця: а) планавае дзяржаўнае рэгуляванне эканомікі; б) суіснаванне дзяржаўнага і прыватнага сектараў эканомікі; в) прыярытэтнае развіццё прадпрыемстваў дзяржаўнай формы ўласнасці; г) шматвектарныя знешнеэканамічныя сувязі; д) моцная сацыяльная палітыка дзяржавы; е) заахвочванне імпарту; ж) павышэнне канкурэнтаздольнасці айчынных тавараў.